Любоў да бацькаўшчыны, роднай мовы прыходзіць праз веданне гісторыі і культуры роднага краю. Каб выхаваць у нашчадкаў пашану да традыцый свайго народа, трэба зазірнуць у мінулае, уявіць, як жылі нашы дзяды і прадзеды, пазнаёміцца з побытам таго часу.

Асновай адраджэння нацыянальнай спадчыны з’яўляецца краязнаўства, у развіцці і вывучэнні якога важная роля сёння належыць бібліятэцы. Бібліятэчнае краязнаўства накіравана на захаванне нацыянальных, этнічных, экалагічных, моўных традыцый краю, на выхаванне павагі да гісторыі, свят і абрадаў, што прыжыліся на тэрыторыі роднага краю, адраджэнне мясцовай культуры.

Ужо на працягу 25 гадоў на базе аддзела абслугоўвання і інфармацыі Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі працуе сектар краязнаўства, які таксама імкнецца да таго, каб назапасіць як мага больш інфармацыі аб сваім родным краі, а затым забяспечыць ёю карыстальнікаў.

Асновай краязнаўчай дзейнасці бібіліятэкі з’яўляецца фонд, які прадстаўляе сабой сукупнасць краязнаўчых дакументаў. Ім карыстаюцца для задавальнення краязнаўчых запытаў чытачоў, для правядзення бібліяграфічнага інфармавання па краязнаўству, у дапамогу правядзення мерапрыемстваў і г.д.

Краязнаўчы фонд нашай бібліятэкі прадстаўлены рэдкімі выданнямі, кнігамі, брашурамі, краязнаўчымі папкамі,картамі, рукапіснымі матэрыяламі, сучаснымі каляровымі і чорна-белымі фотаальбомамі і складае на сённяшні момант больш за 2100 экзэмпляраў. Фонд кніжных выданняў дапаўняе перыёдыка: мясцовыя газеты “Пінскі веснік”, “Полесская правда” і рэспубліканская “Краязнаўчая газета”.




Асаблівую гордасць сектара прадстаўляюць рэдкія матэрыялы аб Пінску, Пінскім раёне і Палессі: А.Грушэўскі “Пинские акты” (15-16ст.), “Пинское Полесье” (14-16ст.), этнаграфічны сборнік “Пінчукі” пад рэдакцыяй Д.Булгакоўскага (1890г.), “Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава”(1911-1912гг.) і інш. У асноўным гэта ксеракопіі.

У фондах ёсць кнігі з аўтографамі, якія падарылі самі аўтары.



У 2011 годзе было вырашана вылучыць такія кнігі ў асобны фонд, на падставе якога быў створаны бібліяграфічны спіс гэтых дакументаў “З любоўю ад аўтараў”. Сярод іх можна знайсці кнігі фалькларыстаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, а таксама зборнікі вершаў мясцовых паэтаў. Кожны год гэты спіс папаўняецца.

Акрамя кніг, перыядычных выданняў, вялікая ўвага адводзіцца вядзенню тэматычных папак, колькасць якіх складае больш за 20. Тэматыка іх самая разнастайная. Сярод іх можна назваць такія, як “Гісторыя




Пінска”, “Іх імёнамі названы вуліцы горада”, “Культура”, “Пінск літаратурны”, “Землякі” і інш. Матэрыял у гэтых папках штогод папаўняецца і назапашваецца.

Кожная бібліятэка імкнецца да таго, каб назапасіць як мага больш інфармацыі аб сваім родным краі, а затым забяспечыць ёю карыстальнікаў. З гэтай мэтай наша бібліятэка ажыццяўляе краязнаўчую бібліяграфічную дзейнасць, якая ўключае арганізацыю і вядзенне краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, падрыхтоўку краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, краязнаўчае бібліяграфічнае абслугоўванне.

Вялікая ўвага надаецца даведачна-бібліяграфічнаму апарату па краязнаўству. У інфармацыйна-бібліяграфічным сектары вядзецца БД “Краязнаўства”, якая ўключае больш за 8000 запісаў. Уключаныя ў БД артыкулы магчыма адшукаць і на сайце Пінскай цэнтральнай бібліятэкі (http://pinsklib.by/) ў раздзеле “Электронный каталог” па шэрагу прымет: аўтару, назве, тэме, прымеце персаналіі, па ключавому слову. Краязнаўчая картатэка адлюстроўвае ў розных аспектах краязнаўчы фонд і матэрыялы з перыядычнага друку.




Інфармацыйна-бібліяграфічным сектарам для сектара краязнаўства выдаюцца краязнаўчыя шорт-лісты да значных падзей у гісторыі нашага горада, а таксама да юбілейных дат вядомых ураджэнцаў Пінска і мясцовых пісьменнікаў. Штомесячна з 2015 года выдаецца інфармацыйны бюлетэнь "Пінск на старонках друку". Крыніцай для падбору матэрыяла для дадзенага бюлетэня з'яўляецца краязнаўчы змест дакументаў.



Сектар краязнаўства таксама займаецца выданнем інфармацыйных матэрыялаў. Адной з традыцыйных форм работы з’яўляецца складанне краязнаўчага календара знамянальных і памятных дат, дзе адлюстроўваюцца юбілейныя даты па гісторыі нашага краю, юбілеі выдатных землякоў, прадпрыемстваў, гаспадарак і ўстаноў.

Традыцыйна актыўным напрамкам краязнаўчай работы бібліятэк з’яўляецца масавая работа. Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў сектары краязнаўства, розныя па сваёй форме і зместу: мінулае і сучаснае, захаванне і адраджэнне гістарычнай і культурнай спадчыны – усё гэта тэмы шматлікіх бібліятэчных мерапрыемстваў.

У мінулым годзе споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння нашага знакамітага




земляка, мастака, кампазітара, музыканта і педагога Напалеона Орды. Менавіта гэтай даце і быў прымеркаваны ўрок краязнаўства “Мастер архитектурного пейзажа”. Падчас сустрэчы да ўвагі прысутных былі прапанаваны відэасюжэты пра Напалеона Орду, альбомы з малюнкамі мастака і нават музыка, якую напісаў сам кампазітар. Госцем мерапрыемства быў мясцовы краязнаўца, карэспандэнт газеты “Пінскі веснік” В.Л. Ільянкоў. Вячаслаў Леанідавіч падзяліўся рэдкімі звесткамі, фотаздымкамі і іншымі матэрыяламі з асабістага архіву. Школьнікам быў прапанаваны яго аповед пра гравюры, прысвечаныя Пінску, радаслоўную сям’і Орда, нашчадкаў нашага славутага земляка, якія і ў наш час наведваюць Пінск. Не застаўся без увагі і той факт, што ў нашым горадзе нейкі час у палацы Бутрымовіча жыў Напалеон Орда, унук Матэўша Бутрымовіча.



Кожны год сектар краязнаўства разам з жыхарамі і гасцямі адзначае дзень горада Пінска. Не засталася без увагі гэтая падзея і ў мінулым годзе.




Так, да 920-годдзя з дня заснавання горада Пінска ў сектары прайшоў урок краязнаўства “Есть город Пинск…” Падчас мерапрыемства юных наведвальнікаў бібліятэкі пазнаёмілі з гісторыяй роднага горада. Вялікую цікавасць выклікаў відэафільм, а таксама электронная прэзентацыя “Стары горад”. Да ўвагі дзяцей таксама была прапанавана кніжная экспазіцыя “С днём рождения, любимый город!”




Каб данесці да кожнага чытача самабытнасць і непаўторнасць роднай мовы і літаратуры, паказаць іх прыгажосць, бібліятэкар сектара краязнаўства праводзіць разнастайныя мерапрыемствы.

Сярод іх – літаратурная гадзіна-знаёмства “Паэтычная Піншчына”, якая прайшла ў рамках абласнога месячніка папулярызацыі нацыянальнай мастацкай



літаратуры “Маіх радкоў няма без Беларусі”.

Падчас мерапрыемства навучэнцы горада пазнаёміліся з мясцовымі паэтэсамі: членам Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь Жанай Завацкай і пачынаючай

паэтэсай Зінаідай Савіла. Пісьменніцы чыталі свае вершы, расказвалі аб сваёй творчасці, адказвалі на пытанні слухачоў. Падчас сустрэчы гучалі песні, напісаныя на словы аўтараў.




У мінулым годзе адбылося некалькі сустрэч не толькі з мясцовымі паэтамі, але і бардамі. З удзелам сектара краязнаўства адбыўся канцэрт аўтара-выканаўцы Таццяны Волкавай “Осенние встречи”. Для многіх жыхароў нашага горада яе імя стала вядома дзякуючы выкананню песень. Падчас канцэрта гучалі музычныя творы, напісаныя вядомымі бардамі, а таксама асабістыя творы аўтара, прысвечаныя Радзіме, роднаму гораду, матулі… Таццяна Юр’еўна распавядала аб сваёй творчасці, з задавальненнем адказала на пытанні слухачоў. Кожны, хто прыйшоў, быў удзячны Таццяне Волкавай за падораную душэўную цеплыню і выдатную сустрэчу з аўтарскай песняй.




З мэтай папулярызацыі знакамітых мясцін роднага краю, знаёмства з гістарычнымі помнікамі сектарам краязнаўства неаднаразова былі арганізаваны краязнаўчыя маршруты. Так, удзельнікі клуба “Благовест” сумесна з наведвальнікамі Уваскрэснай школы для дарослых здзейснілі паездку па святых месцах Баранавіцкага раёна. Яны пабывалі ў некалькіх праваслаўных храмах, пагутарылі са святарамі, наведалі цудадзейную крыніцу “Кипяток”.




Падчас праваслаўна-краязнаўчага ўрока “Святыні роднага краю” дзеці са школ і гімназій горада даведаліся шмат цікавага аб храмах нашага горада, праваслаўных святых і цудатворных іконах нашага краю.



З’явай у культурным і духоўным жыцці горада сталі Трэція краязнаўча-праваслаўныя чытанні “К истокам своим возвращаемся”, праведзеныя на базе духоўна-асветніцкага цэнтра “Вытокі” і сектара краязнаўства цэнтральнай гарадской бібліятэкі. На чытаннях прысутнічалі святары Сарненска-Палескай (Украіна) і Пінскай епархій, краязнаўцы Піншчыны і Лунінеччыны, студэнты і школьнікі навучальных устаноў



горада.Тэмы выступленняў, якія асвячаліся на чытаннях, былі прысвечаны жыціям святароў і гісторыі храмаў палескага краю.

Такія мерапрыемствы, накіраваныя на ўзраджэнне і захаванасць гістарычнай і культурнай спадчыны краю, дапамагаюць змяніць адносіны да духоўна-краязнаўчай літаратуры і ўбачыць яе ролю як выхавальніка патрыятызму, талерантнасці, духоўна-маральных якасцей.

Сектар краязнаўства на працягу доўгага часу падтрымлівае цесныя сувязі з навучальнымі ўстановамі горада, мясцовым тэлебачаннем, рэдакцыяй мясцовай газеты. Дзейнасць цэнтра адлюстроўваецца і на сайце Пінскай цэнтральнай бібліятэкі(http://pinsklib.by/) ў раздзеле “Краеведение”. Тут можна знайсці інфармацыю аб новых паступленнях краязнаўчай літаратуры, аб мерапрыемствах, якія прайшлі ў сектары, матэрыялы аб нашых знакамітых земляках і інш.




Нельга не адзначыць сувязь і з такім цікавым чалавекам, як карэспандэнтам газеты “Пінскі веснік”, краязнаўцам і сцэнарыстам Вячаславам Ільянковым. Ужо шмат гадоў звязвае яго цеснае сяброўства з бібліятэкай. Вячаслаў Леанідавіч аказвае дапамогу ў пошуку краязнаўчага матэрыялу, цікавых гістарычных фактаў, прымае ўдзел у бібліятэчных мерапрыемствах.

Сектар краязнаўства ў сваёй рабоце выкарыстоўвае розныя формы і метады нагляднай, вуснай і пісьмовай папулярызацыі краязнаўчай літаратуры. Сярод наглядных форм работы самай распаўсюджанай з’яўляецца кніжная выстава, якая дапаўняе кожнае мерапрыемства і дапамагае больш поўна раскрыць фонд.

У сектары краязнаўства былі выкарыстаны розныя віды выстаў, такія, як выставы-прапановы, выставы-прагляды, выставы-персаналіі, выставы-напаміны, к юбілейным і памятным датам, тэматычная выставы.

З мэтай нагляднай папулярызацыі кніжных навінак была аформлена выстава-прапанова “Навінкі краязнаўчай літаратуры”. Сярод іх можна было знайсці кнігі, прысвечаныя аднаму з самых старажытных гарадоў Беларусі – Тураву, кнігі аб засяленні старажытнымі славянамі тэрыторыі Беларусі, аповеды аб гарадах і іх гісторыі, аб славутасцях і вядомых мясцінах, і шмат другіх цікавых выданняў, прысвечаных роднаму краю.

Новыя паступленні краязнаўчай літаратуры таксама прадстаўлены ў выглядзе электроннай прэзентацыі на сайце Пінскай цэнтральнай бібліятэкі.

Да 920-годдзя горада Пінска была падрыхтавана разгорнутая кніжная выстава-прагляд “Гісторыя Пінска: ад старажытнасці да сучаснасці”. На ёй размешчаны матэрыялы аб Пінску, пачынаючы з першага летапіснага ўзгадвання ў “Повести временых лет”, матэрыялы аб Грундвальскай бітве, аб атрыманні Пінскам Магдэбурскага права і герба, аб узвядзенні ў горадзе значных пабудоў. Адлюстраваны на выставе і матэрыялы аб Пінску падчас Першай і Другой сусветных войн, цяжкі пасляваенны перыяд, Пінск сучасны. Асобна выдзелены раздзел “Яскравая палітра землякоў”, прысвечаны мясцовым краязнаўцам, эколагам, фатографам, пісьменнікам і паэтам. На выставе шырока прадстаўлены кнігі, фотаальбомы, шорт-лісты, фотаздымкі, а таксама экспанаты з асабістай калекцыі краязнаўца Вячаслава Ільянкова.



Да 210-годдзя з дня нараджэння Напалеона Орды была арганізавана кніжная выстава-персаналія “Напалеон, которым гордится Беларусь”. На выставе былі прадстаўлены манаграфіі пра знакамітага піяніста і кампазітара, кнігі і альбомы з ордаўскімі выявамі беларускіх гістарычных аб’ектаў і пейзажаў.

Афармляюцца выставы і да юбілейных дат мясцовых паэтаў. Так, да 75-годдзя мясцовага паэта Мікалая Лаўровіча была арганізавана кніжная выстава “Исповедь души и сердца”, на якой былі прадстаўлены зборнікі аўтара, выдадзеныя ў розныя гады, крытычны матэрыял па яго творчасці , а таксама шорт-ліст, падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічным сектарам.

З мэтай папулярызацыі беларускага слова, беларускай кнігі была падрыхтавана выстава-прапанова “Чытайце беларускае!”, на якой былі прадстаўлены навінкі мастацкай літаратуры як вядомых беларускіх класікаў, так і мясцовых паэтаў: кнігі паэзіі, прозы, кнігі пра Беларусь, краязнаўчыя нататкі.

Краязнаўчы напрамак работы цесна пераплятаецца з патрыятычным. Так, да Дня вызвалення горада Пінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была аформлена кніжная выстава-напамін “У ліпені 1944-га…”. На выставе шырока экспанаваліся матэрыялы аб Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі, а таксама нашага краю: зборнік лістоў з фронту ўдзельнікаў ВАВ 1941-1945 гадоў, біяграфічныя звесткі героя Савецкага Саюза генерал-маёра В.З. Каржа, матэрыялы аб ваенных гадах у Пінску, аб Пінскай ваеннай флатыліі ў дакументах і ўспамінах і многае іншае.

Па-сапраўднаму зразумець гісторыю сваёй бацькаўшчыны, даведацца пра яе мінулае і сённяшняе, выхаваць павагу і любоў да народных традыцый, захаваць спадчыну – вось асноўныя задачы, над якімі працуе сектар краязнаўства. Работа ў гэтым напрамку працягваецца і далей. Працягваецца пошук новых формаў і метадаў працы ў арганізацыі абслугоўвання чытачоў. Усёй сваёй дзейнасцю сектар краязнаўства імкнецца падтрымліваць і развіваць у іх цікавасць да лёсу сваёй бацькаўшчыны, яе людзей, да сучаснасці і адказнасці за будучае. На гэтым праца

сектара не спыняецца, яна працягвае сваю дзейнасць, развіваецца і далей будзе рада расчыняць гасцінна дзверы для пастаянных  будучых чытачоў.